ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 31 (1143) ● 11 лістапада 1976 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

У ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЯХ БДУ ● ДНІ СТУДЭНТАЎ МІНСКА ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ ● УСПАМІНЫ АБ ЛЕЦЕ ● ЗАМАЛЁЎКІ НАШЫХ ЧЫТАЧОЎ ● ІНТЭРВ'Ю ПЕРШАКУРСНІКА ● ВЫКЛІКАЕМ НА РАЗМОВУ ● ВЯСЁЛЫ НАРОД — ТУРЫСТЫ ● ЯНА ВУЧЫЛАСЯ Ў БДУ ● ТВОЙ ЭТЫКЕТ ● ПАМЯЦЬ АБ ВЯЛІКІМ ПІСЬМЕННІКУ

УНІВЕРСІТЭТ НА СВЯТОЧНАЙ ДЭМАНСТРАЦЫІ



Слаўную гадавіну Кастрычніка ўрачыста і радасна адзначылі студэнты, супрацоўнікі і выкладчыкі ўсіх факультэтаў БДУ. Святкаванне 59-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі паказала гарачае імкненне калектыву універсітэта новымі здзяйсненнямі азнаменаваць дзесятую пяцігодку, прадстаячы юбілей Савецкай улады.

Фота І. АЎДЗЕЕВА.

КАМІТЭТ КАМСАМОЛА ПАВЕДАМЛЯЕ

Напярэдадні святкавання 59-й гадавіны Вялікага Кастрычніка былі падведзены вынікі дзейнасці студэнцкіх атрадаў універсітэта, якія прымалі ўдзел у сельгасработах.

Паміж атрадамі было разгорнута сацспаборніцтва за права называцца лепшым атрадам па выніках сельгасработ. Байцы гістфака і геафака выступілі ў раённых газетах са зваротам да ўсіх атрадаў ударнай працай адказаць на зварот рэктарата, парткома, камітэта камсамола і прафкома сваёй працай унесці ўклад у агульнанародную справу — выкананне планаў дзесятай пяцігодкі.

Па выніках спаборніцтва лепшымі атрадамі прызнаны: атрад імя М. Гастэлы геафака (камандзір Л. Сушко) і атрад беларускага аддзялення філфака (камандзір Г. Кіршчэня), якія працавалі ў Талачынскім раёне; атрад мехмата (камандзір С. Самаль), які працаваў у Міёрскім раёне.

Многія атрады універсітэта ўзнагароджаны граматамі, падарункамі гаспадарак, раённых савецкіх, партыйных і камсамольскіх органаў.

Бюро камітэта камсамола БДУ вырашыла ўзнагародзіць атрады, якія вызначаны пераможцамі ў сацспаборніцтве, граматамі БДУ і экскурсійнымі паездкамі ў Вільнюс, Брэсцкую крэпасць-герой і Белавежскую пушчу.

ПРЭС-ЦЭНТР КАМІТЭТА КАМСАМОЛА БДУ.

У ПРАФКОМЕ БДУ

Адбылося чарговае пасяджэнне прафкома універсітэта, на якім былі размеркаваны абавязкі паміж членамі прафкома, выбран прэзідыум.

У састаў прэзідыума ўвайшлі адказныя за работу камісій прафкома: У. КАМАРОЎСКІ (вучэбна-вытворчая камісія), В. ГАЛОЎЧЫЦ (камісія па кантролю за грамадскім харчаваннем), У. ЛОКІС (культурна-масавая камісія), В. ХАРЫТОН (спартыўна-аздараўленчая камісія), А. РОДЗІК (агітацыйна-масавая камісія), У. ПАЎЛОЎСКІ — старшыня прафкома БДУ, Р. СМАЛЕНСКАЯ — намеснік старшыні прафкома, С. АЛАБЕРДЫЕВА і Т. БАРОДЗІЧ — члены прафкома БДУ.

Арганізацыйна-масавую камісію прафкома ўзначаліў М. ПРАЦЬКО.

Н. ЛЕБЕДЗЕВА.
(Прэс-цэнтр прафкома БДУ).

АДКРЫЦЦЁ ДЗЁН СТУДЭНТАЎ

Сёння адкрываюцца Дні студэнтаў Міншчыны. У праграме:

— Дні працы «Табе, Радзіма, ударная праца!» (11—12 лістапада). Камсамольскі актыў абмяркуе вынікі трэцяга працоўнага семестра 1976 г. і асноўныя напрамкі падрыхтоўкі да лета 1977 г. Камсамольцы БДУ папрацуюць на будаўнічых аб'ектах горада.

— Дні памяці герояў «Мы помнім тых, чые імёны на подзвігі клічуць» (13—14 лістапада). Прадугледжваюцца канферэнцыі чытачоў, урокі мужнасці, сустрэчы з воінамі Савецкай Арміі, экскурсіі ў музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і г. д.

— Дні навукі «Твой уклад у навуку, студэнт!» (15—16 лістапада). Студэнты сустрэнуцца з вядучымі вучонымі універсітэта, правядуць студэнцкую навуковую канферэнцыю «Студэнцкая навука — Ленінскаму камсамолу.

— Дні «Студэнцкая моладзь — піянерам, школьнікам, навучэнцам прафтэхвучылішчаў» (17—18 лістапада). На факультэтах пройдуць «Дні адкрытых дзвярэй», адбудуцца сустрэчы студэнтаў з замежных краін з навучэнцамі падшэфных ГПТВ, у БДУ прыйдуць дэлегацыі школьнікаў.

— Дні прапагандыста «Перакананасць — крылы байцоў» (19—20 лістапада). Выступленне студэнтаў-лектараў на падшэфных прадпрыемствах Мінска, правядзенне семінара студэнтаў-лектараў БДУ.

— Дні спорту «Ад значка ГПА — да алімпійскіх медалёў» (21—23 лістапада). Пройдуць спаборніцтвы студэнтаў БДУ па ваеннаму трохбор'ю на прыз У. Амельянюка. Першакурснікі сустрэнуцца ў фінальным розыгрышы кубкаў БДУ па баскетболу і валейболу, пройдуць спаборніцтвы па праграме здачы норм ГПА.

Дні інтэрнацыянальнай дружбы «За мір, дружбу і антыімперыялістычную салідарнасць!» (24—25 лістапада). Паўсюдна пройдуць сустрэчы камсамольскага актыву БДУ з кіраўнікамі зямляцтваў замежных студэнтаў, якія навучаюцца ва універсітэце. Будуць арганізаваны мітынгі салідарнасці з народам Чылі.

НЕ ЗА ГАРАМІ СЕСІЯ

Шумна і мнагалюдна ва універсітэцкіх калідорах у час перапынку. Нехта спяшаецца ў буфет перакусіць, нехта гартае канспект, праглядвае падручнік. Спрэчкі, жарты... Неналькі дзяўчат стаяць ля акна і ціхенька дзеляцца сваімі сакрэтамі адна з адной.

Але звініць званок, сціхае калідорны шум...

Давайце прыадчынім дзверы і заглянем у адну з аўдыторый.

...Сур'ёзныя, засяроджаныя твары — гэта першакурснікі хімічнага факультэта «асвойваюць» нялёгкую студэнцкую навуку. Ля дошкі — Віктар Сарокін. Шпарка стукае крэйда, выводзячы формулы, прыклады. Першакурснікі спасцігаюць вышэйшую матэматыку. Вядома, прадмет не з лёгкіх, але практычныя заняткі па матэматыцы праходзяць заўсёды жыва, цікава.

Крэйда ў руках другога студэнта. Ёсць рашэнне! Але ён не спяшаецца пакінуць месца ля дошкі, прапаноўвае другі варыянт рашэння прыкладу. Усе з ім згодны? На дапамогу прыходзіць выкладчык У. Скацецкі. Ён заўсёды рассуджвае спрачальнікаў.



Шамацяць перагорнутыя старонкі канспектаў, у іх паяўляюцца ўсё новыя і новыя запісы. Пытанні — адказы... Напружана працуюць студэнты. Не за гарамі сесія, першая сесія студэнтаў-навічкоў. І ні ў якім разе нельга здаць першыя студэнцкія залікі і экзамены дрэнна. Таму сёння ў аўдыторыях стукае крэйда і гучаць спрэчкі — студэнты авалодваюць прамудрасцямі навукі...

Т. ПЕТРАШКЕВІЧ.
Фота Г. МАРОЗАВА.

Успаміны аб леце

АДБІРАЕМ ТАЙНЫ Ў ЗЯМЛІ

Зямля Беларусі захоўвае ў сабе шмат рэчаў — сведкаў далёкага мінулага нашай Радзімы. Сама яна не вельмі імкнецца раскрыць свае тайны перад людзьмі, аддаць ім свае багацці, паказаць свае сховішчы. І галоўная роля ў гэтым належыць людзям цікавейшай прафесіі — археалогіі.

Археалагічныя раскопкі вядуцца зараз ва ўсіх кутках нашай краіны, у тым ліку і ў Беларусі. Летні сезон 1976 года быў багаты на такія даследаванні. Раскопкі вяліся ў Віцебску і Полацку, Лідзе і Мінску, Брэсце і Рагачове, у паселішчах эпохі каменя і бронзы ў басейнах Нёмана, Сожа і Прыпяці. Актыўны ўдзел у археалагічных экспедыцыях прымае гістарычны факультэт універсітэта. Вось і ў сёлетні сезон была арганізавана экспедыцыя пад кіраўніцтвам Э. Загарульскага і В. Рабцэвіча, якая праводзіла раскопкі ў Рагачове.

Рагачоў — адзін са старажытнарускіх гарадоў. Першыя ўпамінанні аб ім мы знаходзім у Іпацьеўскім летапісе пад 1142 годам. Ён упамінаецца ў сувязі з раздачай кіеўскім князем Усеваладам Ольгавічам сваім братам гарадоў Тураўскай і Уладзімірскай зямель. Рагачоў размяшчаўся ў старажытнасці на высокім мысе, утвораным Дняпром і Друццю. Стаяў ён на вядомым гандлёвым шляху «з вараг у грэкі».

Рагачоў зацікавіў археолагаў не ўпершыню. Ужо ў 1967 годзе раскопкі на гарадзішчы праводзіла эспедыцыя АН БССР пад кіраўніцтвам П. Лысенкі, а ў 1973 і 1975 гадах тут працавалі студэнты-гісторыкі БДУ. І кожны сезон археолагі ад'язджалі з багатым выкапнёвым матэрыялам.

Летам 1976 года экспедыцыя гістфака зноў праводзіла раскопкі на старажытным гарадзішчы, якое вядома мясцоваму насельніцтву пад назвамі «Замкавая гара» або «Замак каралевы Боны». Гарадзішча, узвышаючыся над мясцовасцю, служыла добрым абарончым умацаваннем. Яшчэ і зараз на ім відаць рэшткі старажытнага рва.

З першага дня раскопкі распачаліся на плошчы ў 200 кв. м. І адразу ж з першага пласта пайшлі знаходкі. У розных канцах раскопа раздаваліся радасныя воклічы: «Ёсць, знайшоў!». Усе зайздросцілі шчасліўцу, кожны хацеў патрымаць у руках знаходку. Але строгія лабаранты стаялі на сваім: «Давайце працаваць. У канцы працы паглядзіце». А ў хуткім часе знаходкі пайшлі «касякамі».

Раскоп хутка паглыбляўся. Расла колькасць рэчавага матэрыялу. Ні адзін прадмет не мінуў рук студэнтаў-практыкантаў. Хуткія рукі Л. Кейзеравай, О. Болдыравай, І. Савачкінай, А. Кушніра старанна пераціралі кожны камячок зямлі, і нават самыя дробныя знаходкі папаўнялі экспедыцыйную калекцыю.

Праца на старажытнарускім гарадзішчы працягвалася 20 дзён. За гэты час былі знойдзены жалезныя сярпы, шарнірныя нажніцы, нажы, вастрыльныя брускі, дэталі ад пружынных замкоў, шыферныя прасніцы, каля 200 фрагментаў рознаколяровых шкляных бранзалетак. Былі і вельмі цікавыя знаходкі. Яны прадстаўлены сярэбранымі і бронзавымі падвескамі, шкляными пярсцёнкамі, якія вельмі рэдка сустракаюцца на тэрыторыі Беларусі, шыфернай пласцінкай з малюнкамі на рэлігійныя сюжэты. Было знойдзена, упершыню за час раскопак у Рагачове, пісала.

На аснове археалагічных раскопак можна сцвярджаць, што Рагачоў існаваў ужо ў XI стагоддзі, а рассяленне людзей у яго раёне прыпадае на неаліт.

Археалагічная экспедыцыя дала важныя даныя аб культурным, палітычным, гаспадарчым жыцці і гандлі старажытнага горада.

Трэба адзначыць, што археалогіяй на гістфаку займаюцца многія. Пасля стварэння ў 1973 годзе кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін пры ёй пачаў працаваць археалагічны гурток. Ён карыстаецца даволі вялікай папулярнасцю на факультэце. У гуртку вядзецца навукова-даследчая работа. Гуркоўцы прымалі актыўны ўдзел у раскопках у Мінску ў 1974 годзе, Рагачове ў 1975—1976 гадах, археалагічнай разведцы ў 1975 годзе. Многія з іх выязджалі ў экспедыцыі, якія праводзіў сектар археалогіі АН БССР у басейнах Нёмана, Сожа, Дзвіны. Аб навінах археалогіі і этнаграфіі студэнты-гісторыкі маюць магчымасць даведацца з інфармацыйнага выпуску «Археалогія, этнаграфія і друк». Кожны месяц выпускаецца насценная газета «Зніч». Студэнты, якія займаюцца на кафедры археалогіі, не раз удзельнічалі ў рэгіянальных і ўсесаюзных студэнцкіх археалагічных канферэнцыях. І кожны раз іх працы адзначаліся дыпломамі. Трэба сказаць, што ў лютым-сакавіку 1977 года гістфак будзе праводзіць РАСК у сваіх сценах.

А. МАЗУРКЕВІЧ,
студэнт IV курса гістфака.

Надоўга застануцца ў памяці дні адпачынку ў міжнародным студэнцкім спартыўна-аздараўленчым лагеры «Нарач».

НА ЗДЫМКАХ: «Хто перацягне?»; можна быць упэўненым, што абед будзе смачны.

Фота А. ЗЕЛЬДЗІНА.

Людзі вакол нас

МАЦІ ВЯЛІКАГА ДОМА

Ніколі не памыліцца той, хто назаве Надзею Сяргееўну Галіну жанчынай няўрымслівай, энергічнай і маладой, нягледзячы на яе амаль шасцідзесяцігадовы ўзрост. Для сваіх студэнтаў-гісторыкаў, жыхароў інтэрната № 1 БДУ, Надзея Сяргееўна не столькі строгі адміністратар, колькі старэйшы таварыш, дарадчык, маці. І гэта не дзіўна. На працягу дзевяцігадовай працы камендантам інтэрната Надзея Сяргееўна навучылася добра разбірацца ў лабірынце чалавечых характараў, узаемаадносін, з першага позірку ўлоўліваць у чалавеку ўсе добрыя і адмоўныя якасці, каб першыя з іх, як тыя зярняткі, прарасціць, а другія — вырваць з коранем.

Сама Надзея Сяргееўна кажа:

— Што чалавек — то характар. Таму вельмі цяжка падабраць да кожнага ключык. Не ўсё гладка было на першым годзе працы, што і казаць. Дапамог вопыт работы загадчыцай культаддзелам на заводзе, праца нампалітам у тэхнічным вучылішчы.

...Пераступаючы парог інтэрната ўпершыню, добра ведала гэта жанчына, што прыйдзецца перажыць ёй многае. Да яе тут змянілася столькі камендантаў...

Бывала і такое. Аднойчы студэнты інтэрната (тады тут жылі хімікі) вырашылі правесці эксперымент пад назвай «Патоп сярод белага дня». Гэтае «мераприемства» яны правялі найлепшым чынам, за якое потым арганізатары адпаведна папляціліся. Іх не выключылі з універсітэта, не. Надзея Сяргееўна сама знайшла вінаватых і перавыхавала працай.

— Потым, — успамінае Надзея Сяргееўна, — гэтыя парушальнікі сталі маёй надзейнай апорай.

За ўсю сваю працу яна не напісала ніводнай дакладной у рэктарат. І не таму, што хацела загладжваць недахопы, зусім не. Яна вырашыла так: каму, як не ёй, каменданту, лепш разабрацца ў тым або іншым здарэнні?!

— Я не магу без работы, без сваіх выхаванцаў, — кажа Надзея Сяргееўна.

Ці не ў гэтым заключаецца прычына поспеху ў працы? Вось ужо шмат гадоў запар студэнцкі інтэрнат № 1 у сацыялістычным спаборніцтве сярод інтэрнатаў БДУ займае першае месца.

Абапіраючыся на актыў, у які ўваходзяць такія лепшыя студэнты, як У. Паўлоўскі, В. Сілін, М. Баян і іншыя, камуніст Надзея Сяргееўна Галіна ўмела накіроўвае свае арганізатарскія здольнасці на тое, каб кожны студэнт называў інтэрнат сваім другім домам, у якім ён — паўнапраўны гаспадар. І шчасліва ўсміхаецца яна, калі чуе словы ад студэнтаў — «Наш інтэрнат пахне кухняй»...

А. БАШУН.

НАДЗЕЙНЫ ЧАЛАВЕК

Працоўная біяграфія Уладзіміра пачалася ў Мінску на заводзе, куды прыйшоў ён пасля дэмабілізацыі з радоў Савецкай Арміі. Але юнака з Гродзеншчыны з незвычайнай сілай захапіла жаданне вучыцца. Добра падрыхтаваўшыся, Уладзімір паступае на завочнае аддзяленне гістарычнага факультэта БДУ і адначасова ўладкоўваецца тут на працу ў аддзел забеспячэння універсітэта. Мінула чатыры гады. Цяпер аб гэтым Уладзімір успамінае з усмешкай, тады ж усё было не так проста. Вядома, што праца грузчыка мала звязана з рамантыкай. Тут патрэбна фізічная загартоўка, вынослівасць. Нялёгкімі здаліся першыя працоўныя дні. Але побач былі старэйшыя таварышы, якія ў многім дапамагалі навічку, маглі і падказаць, і падбадзёрыць. Дзякуючы цёплым, шчырым адносінам сяброў, ён хутка увайшоў у новы працоўны калектыў.

А потым Уладзімір працаваў... таваразнаўцам. Аднак ён аб гэтым зусім не шкадаваў. Малады «прадавец» вызначаўся стараннасцю, добрасумленнасцю, жаданнем рабіць усё як мага лепш — і таму ў калектыве яго паважалі, прыслухоўваліся да заўваг, парад. У працоўнай кніжцы У. Тарасевіча шмат падзяк. А калі вырашалася пытанне, каго ўзнагародзіць значком «Ударнік дзевятай пяцігодкі», калектыў аддзела забеспячэння БДУ аднадушна галасаваў за кандыдатуру Уладзіміра. А неўзабаве ён стаў інжынерам па забеспячэнню.

Цяпер ад яго залежыць забеспячэнне універсітэта электрапрадукцыяй. Праца патрабуе шмат энергіі і сіл. І Уладзімір спраўляецца з ёю. Такі ўжо ў яго характар — рабіць усё добрасумленна, а гэта, вядома, дае свой вынік. Вось што гаворыць прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы Сяргей Аляксандравіч Ерамееў:

— Уладзімір — гэта надзейны чалавек, чалавек, які не падвядзе. Скажа — абавязкова зробіць. А быць забеспячэнцам не так проста, як здаецца. Бывае, завод заяўку не прымае, няма прадукцыі. Ініцыятыва ў руках — дзейнічай. Тут патрэбны аператыўнасць, уменне арганізаваць сваю працу. Уладзімір вельмі патрэбны нам чалавек.

Г. МАЛАХОЎСКАЯ.

Інтэрв'ю бярэ першакурснік

ПОБАЧ З КАТАЛОГАМІ І КАРТАТЭКАМІ

Пазнаёміўся я з даведачна-бібліяграфічным аддзелам бібліятэкі зусім нядаўна. Я толькі пачынаў сваё знаёмства з бібліятэкай універсітэта, і таму мяне вельмі зацікавіў менавіта гэты аддзел.

Я папрасіў галоўнага бібліёграфа Е. Я. ДУКАР адказаць на некалькі пытанняў.

— Елізавета Якаўлеўна, раскажыце, калі ласка, аб сваім аддзеле.

— Як самастойны даведачна-бібліяграфічны аддзел арганізаван у 1954 годзе. Уся яго праца цалкам падпарадкавана абслугоўванню чытачоў. Вось ужо 22 гады наш аддзел аказвае дапамогу чытачам у падборы літаратуры; інфармуе аб новых паступленнях; дае кансультацыі па пытаннях методыкі самастойных пошукаў патрэбнай літаратуры з дапамогай каталогаў, картатэк, даведнікаў і бібліяграфічных указальнікаў; займаецца складаннем рэкамендацыйных спісаў літаратуры; прапагандуе бібліятэчна-бібліяграфічныя веды сярод слухачоў.

Разнастайная бібліяграфічная і метадычная работа, ажыццяўляемая нашым аддзелам, патрабуе добра арганізаванага падсобнага фонду. Падсобны фонд уключае два галоўныя віды выданняў: даведніцкі і бібліяграфічны. У даведніцкую літаратуру ўваходзяць энцыклапедыі, даведнікі, слоўнікі, календары, карты. Вялікую дапамогу ў падборы літаратуры аказваюць бібліятэчныя каталогі і картатэкі. Каталогі адлюстроўваюць наяўнасць кніг у данай бібліятэцы. Асноўнымі каталогамі бібліятэкі з'яўляюцца алфавітны і сістэматычны. Пры падборы літаратуры па пэўнай тэме належыць звярнуцца да апошняга каталога.

— Якую работу Вы праводзіце з першакурснікамі? Некаторыя з іх нават не ведаюць, што такі аддзел існуе.

— З 1959 года бібліятэка праводзіць са студэнтамі заняткі па бібліятэчна-бібліяграфічнаму мінімуму. Мэта гэтых заняткаў — навучыць студэнтаў карыстацца бібліятэкай увогуле і бібліятэкай універсітэта ў прыватнасці, мець уяўленне аб саставе фонду бібліятэкі, аб яе даведніцкім апараце, умець карыстацца каталогамі і картатэкамі, бібліяграфічным і даведніцкім матэрыяламі, самастойна падбіраць патрэбную літаратуру.

— Што Вы праводзіце сумесна з іншымі аддзеламі бібліятэкі?

— Наш аддзел, напрыклад, штомесячна друкуе бюлетэнь новых паступленняў, які інфармуе аб кнігах, што паступілі ў бібліятэку на працягу месяца. Маючы універсальны кніжны фонд, бібліятэка сумесна з грамадскімі арганізацыямі, кафедрамі універсітэта і актывам чытачоў займаецца масавай работай. Адной з форм масавай работы з'яўляюцца выстаўкі літаратуры. Яны знаёмяць чытачоў з дасягненнямі навукі і тэхнікі, з творамі савецкіх пісьменнікаў, рускіх і замежных класікаў, расказваюць аб будаўніках БАМа, іншых ударных камсамольскіх будоўлях.

— Раскажыце, калі ласка, пра сваіх калег.

— Побач са мной працуюць пяць чалавек. Мае таварышы па рабоце — гэта перш за ўсё людзі, якія многа ведаюць. Якое б пытанне ім ні задалі, што б ні папрасілі, яны заўсёды дадуць правільны адказ, дапамогуць.

Загадчыца аддзела Зінаіда Іосіфаўна Рахманчык фактычна з'яўляецца арганізатарам даведачна-бібліяграфічнага аддзела. Працуе ў ім 23 гады. Гэта вельмі эрудзіраваны чалавек. Да вайны яна паспела закончыць толькі тры курсы філалагічнага факультэта. Калі скончылася вайна, цяга да ведаў, пазнання новага, невядомага прывяла яе ў педінстытут на бібліятэчны факультэт. Скончыла яго на выдатна і была накіравана ў бібліятэку БДУ. У далейшым яна стварыла сістэматычны каталог. Пры непасрэдным удзеле Зінаіды Іосіфаўны выйшлі з друку «Бібліяграфічны зборнік БДУ» — І частка, падрыхтавана ІІ; «Дысертацыі, абароненыя ў БДУ імя У. І. Леніна». Гэта вельмі добрая, чулая жанчына. І яшчэ, па-мойму, галоўнае ў характары Зінаіды Іосіфаўны — любоў да людзей, да сваёй працы, імкненне дапамагчы чалавеку.

Даўно працуюць у нашым аддзеле Ала Васільеўна Някозырава і Іна Казіміраўна Пагодская, старшыя бібліёграфы. Гэта здольныя, адукаваныя людзі, у цэнтры іх увагі — вялікія ўчасткі работы.

Нядаўна пачала працаваць Ала Сцяпанаўна Леус. Яе адметная рыса — працавітасць і добрасумленныя адносіны да працы.

— Елізавета Якаўлеўна, над чым працуе цяпер Ваш калектыў?

— Мы складаем указальнік «Уладзімір Іванавіч Пічэта». Ён — аб першым рэктару універсітэта, гісторыку - славісту. Рыхтуецца ўказальнік літаратуры «Беларускія пісьменнікі — выхаванцы БДУ». Ён складаецца з трох частак: «Паэты», «Празаікі», «Крытыкі». Цяпер рыхтуецца першая частка, у якую ўвойдуць расказы, успаміны аб 75 паэтах, іх творы. Сярод іх такія беларускія таленты, як П. Броўка, М. Лужанін, Р. Барадулін і іншыя.

У. АНДРЫЕВІЧ.

Выклікаем на размову

«ПРЫВІДАЎ» — ЗА КАЎНЕР!

Познім вечарам у інтэрнаце ўсё паступова сціхае: і хрыплы лямант магнітафонаў, і звонкі смех дзяўчат, і гудзенне ліфта. Але прыслухайцеся — і вы пачуеце іншыя, загадкавыя гукі: стогн паркета, скрып дзвярэй, шорганне. Хто гэта?

Не палохайцеся, гэта самыя звычайныя прывіды выйшлі на свой начны промысел. Аказваецца, у наш век тэхнічнага прагрэсу ёсць і такія таямнічыя з'явы.

Прывіды — зусім як людзі з іх слабасцямі. Любяць часам пажартаваць. Напрыклад, бясшумна зняць у калідоры блока люстэрка і разам з ім хутка знікнуць. Іншы раз тую ж маніпуляцыю яны паспяхова праводзяць з покрыўкамі ад унітаза. Здаецца, навошта гэтым бясплотным вандроўнікам з таго свету такая празаічная рэч? Зноў жа ў пекле, адкуль з'явіліся прывіды, дастаткова святла ад кастроў, на якіх чэрці смаляць няшчасных грэшнікаў. І нікому там не патрэбны лямпачкі, а між тым яны знікаюць з блокаў. Урэшце, навошта прывідам пробкі ад ванны ў той час, калі, па апошніх звестках, Ціхі акіян нідзе не цячэ і працякаць не збіраецца, а таму жыхарам краіны Люцыфера не пагражае небяспека грандыёзнага патопу.

Раніцай студэнты прачынаюцца і з жахам выяўляюць прапажу. Адразу пачынаецца паломніцтва па чужых пакоях.

Жарты прывідаў далёка заносяць люстэрка, пробкі, покрыўкі і іншыя малагабарытныя рэчы. Гісторыя з пакражай канчаецца тым, што абрабаваныя ўздыхаюць і складваюць грошы на новае люстэрка.

А што ж прывіды? Яны так жа скрыпяць і шоргаюць па начах. Ды толькі адно слабае месца ёсць у іх: захопленыя за сваёй паскуднай справай, яны раптам губляюць таямнічы выгляд і робяцца звычайнымі і вельмі напалоханымі зладзюжкамі. Трэба выкарыстоўваць гэтую ўласцівасць начных прывідаў. За каўнер іх!

П. ВАСЮЧЭНКА.

САДРУЖНАСЦЬ НЯСТОМНЫХ І ЖЫЦЦЯРАДАСНЫХ

Турысты... Я шчаслівая, што магу хоць крыху расказаць вам аб гэтых цікавых людзях. Хіба не здорава пабываць на Памірах, Каўказе, пасядзець ля кастра, паслухаць песні пад гітару?! Турысты...І я адразу ж успамінаю сустрэчы з удзельнікамі турклуба нашага універсітэта. Выдатныя рабяты! Знаёмцеся!

Таццяна Кобец. У турклубе з 1974 года. Здавалася б, гэта мала. А за плячыма столькі цікавага! Вясенні (майскі), асенні і зімовы паходы. Валдайскія узвышшы, Каўказ... А Тані хочацца пабываць абавязкова на Урале, у Хібінах... Ды хіба толькі там. Ёй падабаецца хадзіць у паходы. Бо заўсёды побач сябры. Моцныя людзі, як гаворыць сама Таня.

Анатоль Новікаў. Закаранелы турыст. У турклубе пяты год. Больш за ўсё цэніць у турысце ўменне прыйсці на дапамогу, выручыць сябра; таварыскасць і чалавечнасць. Турызм прывабліває яго знаёмствам з новымі людзьмі. Ну, а навічкам

У суботу, 23 кастрычніка, на аўтаванзале міжволі ўсе вылучалі групу людзей у падношаных штармоўках, кедах, з рукзакамі і палаткамі. Прахожыя дружалюбна ўсміхаліся: «І нясе ж гэтых турыстаў!» Праз некалькі мінут мы сапраўды несліся ў аўтобусе прама на Ракаў.

Дружалюбны і вясёлы народ — турысты! У дарозе пяюць, дзеляцца ўражаннямі... Здаецца, быццам ведаеш іх даўным-даўно. Яны самі лічаць, што галоўная якасць турыста — таварыскасць.

Маленькая рачулка, палаткі на крутым беразе, дымяцца кастры, дзесьці чуваць гітара... Колькі цікавых песень прысвечана турыстам. А гэта ж нездарма!

Змярканне... А ў палатачным гарадку весела і шумна — ідуць спаборніцтвы. Начная паласа перашкод. Удзельнічаць хочуць усе.

Пасля спаборніцтваў — касцёр да ранку. Што можа быць лепш дымнага кастра?! Нездарма ж у песні пяецца: «Не за огонь люблю костёр, за тесный круг друзей...»

А раніцай — усе зноў у чаканні спаборніцтва. І пакуль яны не пачаліся — варыцца снеданне. Здорава хтосьці сказаў: «Турыст заўсёды паесці гатоў, хоць нават зварана палена!» Падыйдзі да любога кастра — і ты сагрэешся. Сагрэешся нават ад таго, што вакол цёплыя позіркі добрых вачэй. Раблю вывад, што галоўнае ў турызме — чалавечнасць. Успамінаю Энзюперы: «Людзі, будзьце чалавечнымі! Гэта ваш найпершы абавязак».

Турзлёт прайшоў. Хутка зноў у паход. Такі ўжо непаседлівы гэты народ — турысты!

В. КОЗЕЛ.

...І НЕ ЗАБУДЗЬЦЕ ГІТАРУ

«Падарожжы зберагаюць маладосць».
Н. М. ПРЖЭВАЛЬСКІ.

Ці так гэта цяжка — укласці рукзак і ўзяць білет на электрычку? Але мы часта чамусьці паўтараем, з сумам гледзячы ў стол:

— Саяны... Вось туды б махнуць...

І едзем... у кіно. А зусім побач — Браслаўскія азёры. Хіба абавязкова пачынаць з Карэліі ці з Курыльскіх астравоў? Першыя паходы могуць быць і зусім непрацяглымі, няхай нават адны суткі.

...Збіралася група ў паход. Узяты напракат палаткі, распрацаван маршрут. І першы пункт — гастраном. Пры гэтым купляецца далёка не хлеб. Да глыбіні душы пракляты — лепш абысціся без гэтага пункта. Паспрабуйце выбраць месца дзе-небудзь ля ракі і закінуць вудачкі. Уха нават з двух акунькоў атрымаецца выдатная!

А шашлыкі? Ды ні адзін шашлык па-карскі не параўнаць з цудам, якое трымаеш у руках!

Самае складанае — палатка. Тая, якую даводзіцца ставіць упершыню ў жыцці. Потым чамусьці пападаюцца зусім простыя, але гэтая па сваёй канструкцыі складаная настолькі, што сур'ёзна пачынаем думаць аб шалашы. Затое праз які год можна дапамагаць навічку і між іншым заўважыць:

— Хіба гэта палатка! Вось, памятаю, хадзілі мы ў Пухавічы...

Пасля гэтага можаце не сумнявацца, развесці касцёр не даверацца нікому, акрамя вас.

Калі касцёр цудам загарыцца, ваш аўтарытэт стане бясспрэчным. «На вячэру будуць, — аб'яўляеце вы, — шашлыкі». Іх гатуюць з чаго хочаш. Лепш за ўсё за аснову ўзяць мяса, але прыгодны і каўбаса, і хлеб, і сала, і сыр, і салёныя агуркі... Справа бяспройгрышная: першы шашлык усе з'ядуць з цікавасці...

Калі каму-небудзь захочацца сырадою, не спрабуйце падаіць карову, якая пасвіцца побач. Гэта можа прывесці да самых нечаканых вынікаў... Лепш за ўсё схадзіць у бліжэйшую вёску і купіць у магазіне два-тры пакеты. У іншых выпадках — ідзіце па дварах. Толькі ніколі не пачынайце размову словамі: «Прыгожая пасялянка!..» Паверце, такое заканчваецца вельмі дрэнна...

Калі вы ўжо маеце вопыт, то ведаеце самі, якія маршруты выбіраць. Калі не — асмелюся параіць.

Для пачатку трэба навучыцца якім-небудзь нескладаным рэчам. Галоўнае — хадзіць. Проста нецікава ўсё жыццё быць пасажырам. А прайсці кіламетраў дзесяць з рукзаком за плячыма па бездаражы не так-та лёгка. Таму пачынайце толькі з простых маршрутаў. Не бярыце нічога лішняга. У лесе можна знайсці многае. І пастарайцеся, каб у групе быў хоць адзін навічок. Яго вопыт здорава спатрэбіцца.

Калі выявіце, што ў навакольлі Мінска вам ужо нецікава, можаце адправіцца хаця б на тыя ж Браслаўскія азёры. Паверце, успамінаў хопіць надоўга. Абавязкова захапіце фотаапарат. І не забудзьце гітару...

У. ЛЯЛЕКА.
Фота **Г. Марозава.**

ПАЖАДАЙ МНЕ СТО ВЯТРОЎ!

Першая наша сустрэча з удзельнікамі турыстычнага клуба БДУ адбылася на яго пасяджэнні. Шчыра кажучы, я не спадзявалася ўбачыць тут столькі людзей і некалькі здзівілася: няўжо гэта ўсё тыя, хто па-сапраўднаму захапляецца турызмам і аддае яму ўвесь свой вольны час? З гэтым пытаннем я і звярнулася да актыўнага ўдзельніка, ветэрана клуба, студэнта IV курса фізічнага факультэта Сяргея Баранава:

— Клуб наш ужо немалады. Ва універсітэце ён быў створаны ў 1959 годзе і, безумоўна, за гады свайго існавання паспеў стаць папулярным сярод студэнтаў, якія сапраўды паважаюць спорт і вельмі любяць падарожнічаць. Магчыма, гэта і з'яўляецца галоўнай прычынай таго, што колькасць жадаючых сур'ёзна займацца турызмам з кожным годам павялічваецца. Вось і ў гэтым навучальным годзе наш клуб папоўніўся студэнтамі-першакурснікамі, якія таксама аддаюць перавагу турызму.

Калі я прыйшла на трэніроўку, каб паглядзець, як і чым займаюцца турысты, то заўважыла сярод іх нямала навічкоў, якія прыйшлі сюды ўпершыню і таму паводзілі сябе яшчэ не зусім упэўнена. Былі тут і знаёмыя студэнты. Іра Каструбай, першакурсніца фізфака, вырашыла займацца ў секцыі горнага турызму. Больш за ўсё яна любіць горы і вельмі захапляецца спортам.

Дарэчы, з гэтага года клуб пачаў спецыялізавацца па секцыях: альпінізму, горнага турызму, воднага плавання, лыжнага спорту. Самай вялікай з іх з'яўляецца секцыя альпінізму (каля ста чалавек).

Чым жа тлумачыцца тое, што большасць удзельнікаў клуба — альпіністы?

Напэўна, не знойдзецца такога чалавека, які б не любіў рамантыку дальніх дарог, вандраванні, добрую песню і вясёлы жарт у цесным сяброўскім асяроддзі ля дагараючага кастра. Але той, хто хоць раз пабываў у гарах, абавязкова захоча вярнуцца сюды зноў. Горы зачароўваюць кожнага. І, як лічыць адзін з даўніх удзельнікаў турклуба Ігар Рэнгарт, горы дапамагаюць больш пазнаць усю прыгажосць нашай Радзімы. Ігар разам з сябрамі пабываў на Памірах, Каўказе, Паўночным Урале, у Карэліі. І менавіта тут, у гэтых паходах, у частых сутыкненнях з цяжкасцямі вывяраецца трываласць сяброўскай дружбы.

Я спытала ў Ігара, які паход яму больш запомніўся. Ён адказаў, што ў памяці заўсёды застаецца апошняе вандраванне, бо яно багатае на ўражанні і прыгоды.

— А што б ты пажадаў тым, хто толькі нядаўна стаў удзельнікам вашага клуба, але ўжо марыць аб сваім першым паходзе?

— Добрага надвор'я. Гэта галоўнае ў нашай справе.

А. ЛАПЦЁНАК,
студэнтка журфака.

Памятаюць Грына

Калі мы ўспамінаем пра Аляксандра Грына, то імя яго чамусьці абавязкова звязваецца ў нашым усведамленні калі не з экзатычнымі Зурбаганам і Лісам, то ў крайнім выпадку з Феадосіяй ці Старым Крымам — гарадамі, дзе прайшлі апошнія гады яго жыцця і творчасці. Але ж мала хто пры гэтым успомніць аб невялікім горадзе Слабадскім Вяцкай губерні (цяперашняя назва Вяткі — г. Кіраў), дзе ў сям'і служачага піваварнага завода, удзельніка польскага паўстання 1863 года, нарадзіўся будучы пісьменнік-рамантык.

У музейнай вітрыне — пажоўклы ад часу нумар газеты «Вятская речь», які выйшаў 4 мая 1908 года. На яго старонках упершыню быў надрукаван расказ А. Грына «Трэці паверх».

Школьніца ў карычневай форменнай сукенцы, стоячы ля вітрыны, уважліва чытае змешчаны ў ёй аўтограф пісьменніка: «Мне расказалі, што я апынуўся ў Лісе дзякуючы аднаму з тых рэзкіх захворванняў, якія наступаюць раптам. Гэта адбылося ў дарозе». У верхняй частцы рукапіса рукою Грына напісана: «Бягучая па хвалях». У гэтым раздзеле змешчаны і кнігі Грына, пераведзеныя і выдадзеныя на розных мовах народаў СССР, а таксама надрукаваныя за мяжою.

...Закончан агляд літаратурнага музея. Мы выходзім на ажыўленыя вуліцы і працягваем знаёмства з грынаўскімі месцамі горада Кірава.

Вось прыземісты будынак, які калісьці займала Вяцкае рэальнае вучылішча. Рэаліст Аляксандр Грынеўскі быў выключан адсюль за сатырычныя вершы, накіраваныя супраць настаўнікаў-рэакцыянераў.

Мы спыняемся і ля старога цаглянага дома з мезанінам на вуліцы Валадарскага, 44. Тут таксама жыла ў свой час сям'я Грынеўскіх. Дом зусім нядаўна капітальна адрамантаван. У бліжэйшы час будзе адкрыт мемарыяльны музей Аляксандра Сцяпанавіча Грына. Імя яго прысвоена лепшай набярэжнай горада, імем праслаўленага пісьменніка-рамантыка названа і адна з гарадскіх бібліятэк.

Л. ТАЧОНЫ.

Спорт

Старт аднаго з забегаў асенняга лёгкаатлетычнага кросу.
Фота А. БАСАВА.

МЫ ЗАПРАШАЕМ ГАСЦЕЙ

Вы запрасілі сёння гасцей. Спадзяёмся, зрабілі гэта загадзя, хаця б напярэдадні. Запрашэнне, атрыманае ў той жа дзень, выклікае даволі нявыгаднае ўражанне. Напэўна, вы падлічылі, хаця б прыкладна, колькі чалавек змогуць сесці за стол. Калі замест пятнаццаці прыйдуць дваццаць пяць, зручна рассадзіць іх, згадзіцеся, будзе даволі цяжка. Нарэшце, вы, безумоўна, не забылі ўказаць дакладны час. Гэта куды правільней, чым сказаць нядбайна: «Заходзьце сёння вечарам».

Госць, які прыйшоў першым, заўсёды патрабуе найбольшай увагі. Звычайна ён адчувае сябе няёмка, яму здаецца, што ён паспяшаўся, прыйшоў раней тэрміну. Ні ў якім разе не кідайце яго ў пакоі на волю лёсу, пастарайцеся заняць гутаркай, пакажыце альбом з маркамі ці калекцыю сямейных здымкаў.

Вы задумаліся, як правільна рассадзіць гасцей? Калі ў маладзёжнай кампаніі аказаліся двое ці трое пажылых людзей, старайцеся пасадзіць іх побач. Мужа з жонкаю саджаць побач не належыць, выключэнне можа быць зроблена толькі для маладажонаў.

Ініцыятыва адыходу заўсёды належыць гасцям. Праўда, развітвацца рана — можна пакрыўдзіць гаспадароў, тым больш, што і астатнія госці пачнуць збірацца. Але яшчэ горш прымусіць гаспадара паглядваць на гадзіннік.

Як вызначыць «гадзіну раз'езду»? Тактоўны госць сам павінен адчуць гэты момант. Жан-Жак Русо гаварыў: «Чалавек разумны пойдзе за хвіліну перад тым, калі ён быў бы лішнім».

Калі абставіны склаліся так, што госць вымушан пайсці вельмі рана, ён павінен абавязкова папярэдзіць аб гэтым гаспадыню і пайсці непрыкметна, не развітваючыся. Ну, а тыя, хто ўходзіць своечасова, развітваюцца агульным паклонам, не абавязкова за руку. Толькі памятайце: спачатку развітацца, а потым надзець паліто...

Лісток ДАІ

Што і казаць, напружаная пара цяпер у студэнтаў. Хутка сесія. Прадбачлівы студэнт спяшаецца нагнаць упушчанае. Спяшаецца ў бібліятэку, каб запасціся неабходнай літаратурай. Спяшаецца, каб паглядзець новы фільм ці спектакль. Спяшаецца, спяшаецца....

«Спяшалася...»,—коратка тлумачыць сваё парушэнне студэнтка тэхналагічнага тэхнікума Г. Навакоўская, рызыкнуўшая перабегчы вуліцу на чырвоны сігнал светафора.

«Парушыла. Больш не буду», — апраўдваецца будучы ўрач С. Лявіцкая, перабягаўшая вуліцу там, дзе рабіць гэта небяспечна. «Зазяваўся», — лаканічна піша ў сваім тлумачэнні трэцякурснік педінстытута В. Філаткін. Вядома, пералічаным вышэй таварышам непрыемныя і тлумачэнні з інспектарам дарожнага нагляду, і штраф. Тры рублі для студэнта — вялікія грошы. А ўявіце сабе, што магло здарыцца! Не сакрэт жа, што ўсе парушэнні правіл бяспекі руху, кажучы навуковай мовай, маюць капулятыўныя ўласцівасці — яны накапліваюцца, і вось — аварыя!

Чым, як не гэтымі ўласцівасцямі, можна растлумачыць паяўленне ў картачках уліку Дзяржаўтаінспекцыі вось такіх, напрыклад, запісаў: «24 кастрычніка пад колы аўтамабіля папаў работнік інстытута народнай гаспадаркі Дзям'янчанка, які перасякаў скрыжаванне вуліц Першамайскай і Чырвонаармейскай на чырвоны сігнал светафора». «28 кастрычніка на Ленінскім праспекце адбыўся наезд аўтамабілем на першакурсніцу педінстытута Маскалёву, не падумаўшую аб тым, што пераходзіць вуліцу там, дзе няма пераходу, небяспечна».

Гэтыя трагічныя выпадкі былі аператыўна разабраны ў калектывах, атрымалі адпаведную ацэнку з боку адміністрацыі і грамадскіх арганізацый.

А там, дзе гэтага не здарылася? Колькі часу чакаць паставы для размовы? Растлумачальную работу сярод студэнтаў і супрацоўнікаў трэба наладзіць паўсюдна. Аб тым, што такая неабходнасць наспела, гавораць шматлікія пратаколы Дзяржаўтаінспекцыі.

Г. СТРАЛЬЧОНАК,
інспектар ДАІ.

Я Ў ГЕАГРАФЫ ПАЙШОЎ...

З лістапада на геаграфічным факультэце адбыўся вечар, прысвечаны пасвячэнню першакурснікаў у студэнты.

Успамінаю гэты дзень... І адразу ж перад вачыма паўнюткая аўдыторыя, шчаслівыя твары. Сабраліся разам першакурснікі, старшакурснікі, выкладчыкі геафака. Вечар адкрыў дэкан М. Раманоўскі. Ён пазнаёміў былых абітурыентаў з факультэтам, са справамі геграфаў. Шмат цёплых слоў было сказана ў адрас удзельнікаў будаўніцтва геаграфічнай станцыі ля Валожына. Нямала добрых слоў пачулі і удзельнікі геаграфічных экспедыцый, паходаў. Хіба можна забыць Памір, Каўказ або Якуцію?! А ў першакурснікаў гэта ўсё яшчэ наперадзе.

І вось, нарэшце, самы цікавы момант — клятва. Крыху хвалюючыся, першакурснікі клянуцца заўсёды і ўсюды адчуваць сябе жыхарамі краіны Геафакіі. І птушкай б'ецца ў іх далонях доўгачаканы студэнцкі білет...

К. ВЕРАНІКІНА.

Расказы пра нашых выпускнікоў

ДОБРЫ ДЗЕНЬ, ДЗЕЦІ!

праседжвала за падручнікам, рашала задачы і прыклады павышанай складанасці, шукала больш рацыянальныя шляхі. Але хвароба часта прымушала заставацца дома. І, каб не адстаць ад сяброў, дзяўчына ўпарта і настойліва самастойна працавала над кнігамі. Школу закончыла з залатым медалём. І зусім не думала, што любоў да матэматыкі перарасце ў мару стаць выкладчыцай гэтага прадмета, а вузкая сцяжынка, якою кожнай раніцай кročыла да школы, стане шырокай дарогай жыцця.

Ніна Аляксандраўна Тарасевіч уважлівым позіркам абводзіць клас. Ад яе ўдумлівых вачэй ніколі не схаваецца вучань, які не падрыхтаваў урок.

— Запішыце дату. Сёння возьмем новую тэму.

Роўнымі літарамі настаўніца акуратна выводзіць на дошцы: «Кіслоты, іх класіфікацыя і ўласцівасці».

— Спачатку давайце ўспомнім матэрыял з сёмага класа.

На яе ўроках заўсёды так. Для таго, каб добра і трывала засвоіць новы матэрыял, неабходна ўспомніць мінулагодні.

— Хто запіша чатыры вядомыя вам кіслоты? Лена? Калі ласка.

Зусім непрыкметна Ніна Аляксандраўна перайшла да тлумачэння новай тэмы. Сухія формулы перасталі быць сухімі, атрымалі новы сэнс. Шаснаццаць пар дапытлівых вачэй напружана сочаць за настаўніцай. Вось так, крок за крокам, пачынаючы з самых простых формул, яна ўводзіць іх у навуку.

Захапляючае падарожжа ў цудоўную і незвычайную краіну — Хімію — парушае звонкагалосы званок. І дзеці, акружыўшы цесным колам настаўніцу, вырашаюць незразумелыя пытанні. Ну, вось усё выяўлена. Разам накіроўваемся ў настаўніцкую. У гэты момант яна нагадвае невялікі, але ажыўлены вулей.

Настаўнікі пачынаюць наперабой паведамляць тыя важныя падзеі, з якіх і складаецца штодзённае бурлівае школьнае жыццё. У гэты момант яны вельмі нагадваюць сваіх маленькіх заклапочаных выхаванцаў.

Званок. Засталіся я і Ніна Аляксандраўна Тарасевіч. На размову нам адведзена толькі 45 мінут, і Ніна Аляксандраўна пачынае штрых за штрыхом успамінаць сваё жыццё. Доўга яшчэ не можа супакоіцца: «Пісаць пра мяне? Дык у нас жа ёсць выкладчыкі з вялікім вопытам работы ў школе і таксама закончылі універсітэт». Крыху пазней мне стала зразумела, чаму менавіта яе рэкамендаваў дырэктар Слабадской васьмігадовай школы Ф. Філіповіч: «Вельмі працавітая, добрасумленна адносіцца да сваіх абавязкаў. У гэтым годзе мы пастанавілі абагульніць яе вопыт».

...Дзяўчына хадзіла ў школу. І больш за ўсё любіла матэматыку. Не, не толькі таму, што яна лёгка давалася ёй. За лічбамі і формуламі паўставаў другі свет для дзяўчынкі. Таямнічы і загадкавы. Яна была гатова спрачацца з сябрамі, улюбёнымі ў літаратуру, адстойваючы прывабнасць матэматыкі. Не адну ноч маленькая Ніна характару, густу, схільнасцях. І да кожнага трэба знайсці індывідуальны падыход, падабраць свой, як кажуць, ключык, увесці ў складаны свет матэматыкі і хіміі. Ніна Аляксандраўна неяк па-свойму ўмее разгадаць таямнічасць сваіх вучняў. Для кожнага знойдзецца ў яе цёплае душэўнае слова. Калі ішла ў дэкрэтны водпуск, яе вучні нават плакалі. І па чарзе бегалі да дырэктара: «А калі наша Ніна Аляксандраўна прыйдзе?» Так і казалі—«наша».

Калі ж хто-небудзь не падрыхтаваў урок, літасці не будзе. Вучань абавязкова застанецца пасля ўрокаў, і настаўніца будзе з ім да таго часу, пакуль ён як след не падрыхтуе матэрыял. А дома яе чакаюць сямейныя клопаты. Асабліва многа ўвагі да сябе патрабуе маленькая дачушка. Ды і сама Ніна Аляксандраўна вельмі часта хварэе. Аднойчы ёй муж сказаў: «Можа б ты пайшла на іншую работу, больш лёгкую...» — «Не, на другой я не змагу працаваць», — адказала тады.

Ды хіба ж шукала яна ў жыцці лёгкіх месц! Гэтаму вучыць і сваіх выхаванцаў.

— Вельмі люблю я дзяцей, — гаворыць Тарасевіч. — Можа таму заўсёды ўспрымаю нават іх свавольствы, як нешта звычайнае. Дзеці ёсць дзеці, і аднімаць у іх дзяцінства нельга.

...Да пачатку ўрока засталося ўсяго некалькі мінут. Твар настаўніцы—строгі, задуменны. Ніна Аляксандраўна прадумвае кожнае слова, кожны рух, кожную дробязь. Вось і можна ісці. Усё распланавана, вырашана і абдумана. Адкрывае дзверы, і маўклівую цішыню парушае мяккі голас:

— Добры дзень, дзеці!

І. АБРАМОВІЧ,
студэнтка III курса журфака.

В. а. рэдактара В. А. ВОЛЬСКІ.

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз.
Аб'ем — 1,5 друк. ар. АТ 00534 Зак. № 1628

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.